Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 18 ноября 2008 г. N 8/19882

**ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**6 лістапада 2008 г. N 38**

# АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ НАРОДНЫМ (УЗОРНЫМ) НЕПРАФЕСІЙНЫМ (АМАТАРСКІМ) КАЛЕКТЫВЕ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

На падставе пункта 2 артыкула 32 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1991 года "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2004 года Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб народным (узорным) непрафесійным (аматарскім) калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь.

2. Прызнаць страціўшым сілу Палажэнне аб народным (узорным) самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанае Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь 5 мая 1999 г. (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 1999 г., N 44, 8/373).

Міністр У.Ф.МАТВЕЙЧУК

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік Міністра
працы і сацыяльнай
абароны
Рэспублікі Беларусь
М.А.Шчоткіна
04.11.2008

УЗГОДНЕНА
Намеснік Міністра
адукацыі
Рэспублікі Беларусь
К.С.Фарыно
09.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня Федэрацыі
прафсаюзаў Беларусі
Л.П.Козік
09.10.2008

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік старшыні
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
М.І.Юхімук
04.11.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.П.Андрэйчанка
08.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.С.Якабсон
08.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Я.Саўчанка
06.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
Б.В.Батура
07.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
Л.Ф.Крупец
08.10.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
М.Я.Паўлаў
09.10.2008

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
06.11.2008 N 38

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ НАРОДНЫМ (УЗОРНЫМ) НЕПРАФЕСІЙНЫМ (АМАТАРСКІМ) КАЛЕКТЫВЕ**
**МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ**

1. Палажэнне аб народным (узорным) непрафесійным (аматарскім) калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь (далей - Палажэнне) вызначае парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення наймення "народны" ("узорны"), асаблівасці прававога становішча непрафесійнага (аматарскага) калектыву мастацкай творчасці з такім найменнем з мэтай падтрымкі, развіцця і папулярызацыі народнай творчасці і народных промыслаў (рамёстваў).

2. Найменне "народны" ("узорны") прысвойваецца пастаянна дзеючым непрафесійным (аматарскім) калектывам мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь (далей - аматарскі калектыў) пры наяўнасці адпаведнага мастацкага ўзроўню і творчых паказчыкаў, прадугледжаных дадзеным Палажэннем.

Найменне "народны" прысвойваецца дарослым аматарскім калектывам, у якіх не менш за 80 працэнтаў удзельнікаў маюць узрост 18 гадоў і болей.

Найменне "ўзорны" прысвойваецца дзіцячым аматарскім калектывам, у якіх не менш за 80 працэнтаў удзельнікаў маюць узрост да 18 гадоў.

3. Права на прысваенне наймення "народны" ("узорны") маюць аматарскія калектывы, якія займаюцца мастацкай творчасцю, дзейнасць якіх адпавядае прыярытэтам дзяржаўнай культурнай палітыкі, накіраванай на развіццё беларускай нацыянальнай культуры, аматарскай мастацкай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, і якія маюць адпаведны мастацкі ўзровень і творчыя паказчыкі:

пастаянная творчая дзейнасць аматарскага калектыву, якая адпавядае ўсім патрабаванням Палажэння аб непрафесійным (аматарскім) калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 верасня 2008 г. N 34 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2008 г., N 252, 8/19650), на працягу не менш за тры гады;

сістэматычнасць і грамадская значнасць творчай дзейнасці аматарскага калектыву, актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца заснавальнікам, культурным жыцці свайго рэгіёна;

засваенне і папулярызацыя лепшых узораў айчыннага і сусветнага мастацтва;

захаванне (у залежнасці ад жанравай накіраванасці) рэгіянальных фальклорных музычных, харэаграфічных, спеўных і іншых стылістычных асаблівасцей, манеры выканання, мясцовага касцюма;

творчая дзейнасць, якая вылучаецца своеасаблівасцю і самабытнасцю;

наяўнасць адпаведнага ўзроўню і разнастайнасці методык, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбна-творчай, рэпетыцыйнай, канцэртнай і выставачнай дзейнасці калектыву;

наяўнасць самастойнай канцэртнай праграмы і правядзенне канцэртнай і выставачнай дзейнасці не радзей як адзін раз у адзін-два месяцы (на працягу гадавога плана творчай дзейнасці аматарскага калектыву), пры гэтым для дарослых калектываў працягласць канцэртнага выступлення, спектакля, прадстаўлення, дэманстрацыі фільма павінна быць не менш за 40 хвілін, для дзіцячых калектываў - не менш за 20 хвілін, выстаўкі (для дарослых і дзіцячых калектываў не менш за 9 кв. м сапраўднай плошчы прадстаўляемых работ);

удзел у зборных канцэртных і выставачных мерапрыемствах, грамадскіх акцыях, урачыстасцях і іншых не радзей як адзін-два разы ў месяц (на працягу гадавога плана творчай дзейнасці аматарскага калектыву);

правядзенне справаздачнага канцэрта, спектакля, прадстаўлення, дэманстрацыі фільма, выстаўкі за год з улікам аднаўлення канцэртнай праграмы або выстаўкі не менш чым на 20 - 25 працэнтаў штогод;

мастацкі ўзровень і змест рэпертуару, канцэртнай праграмы, выстаўкі, паказу павінны найбольш поўна адлюстроўваць адпаведны від мастацтва, жанр, змест і форму дзейнасці аматарскага калектыву;

наяўнасць (у залежнасці ад жанравай накіраванасці) у рэпертуары твораў беларускіх аўтараў, мясцовых фальклорных твораў;

высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства;

высокі ўзровень сцэнічнай і выставачнай культуры;

адпаведнасць выконваемых і прадстаўляемых твораў усталяваным традыцыям плыняў, накірункаў, жанраў мастацтва;

мастацка-эстэтычнае афармленне канцэртных праграм;

наяўнасць звання лаўрэата, дыпламанта раённых, гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных аглядаў, конкурсаў, фестываляў, выставак і іншых творчых мерапрыемстваў, іншых узнагарод, якія характарызуюць дасягненні творчай дзейнасці аматарскага калектыву.

4. Права на вылучэнне аматарскага калектыву на найменне "народны" ("узорны") мае арганізацыя, якая з'яўляецца заснавальнікам аматарскага калектыву.

5. Арганізацыя, якая вылучае аматарскі калектыў на найменне "народны" ("узорны"), накіроўвае хадайніцтва аб прысваенні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны") у адрас упраўлення культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама.

Да хадайніцтва дадаюцца:

копія пашпарта аматарскага калектыву ў 2 экзэмплярах;

копія першай старонкі статута (палажэння) арганізацыі, на базе якой дзейнічае аматарскі калектыў, у 2 экзэмплярах;

узгадненне з органамі рэспубліканскага кіравання згодна з ведамаснай прыналежнасцю аматарскага калектыву;

інфармацыя аб творчай дзейнасці аматарскага калектыву за апошнія тры гады ў 2 экзэмплярах;

творчыя характарыстыкі кіраўніка аматарскага калектыву, акампаніятара, хормайстра, балетмайстра, канцэртмайстра, рэжысёра і іншых спецыялістаў, якія працуюць у калектыве (пры іх наяўнасці), у 2 экзэмплярах;

поўны спіс твораў рэпертуару аматарскага калектыву або спіс твораў дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага мастацтва, якія знаходзяцца ў фондах аматарскага калектыву, у 2 экзэмплярах;

спіс твораў канцэртнай праграмы аматарскага калектыву або спіс твораў выставы дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага мастацтва аматарскага калектыву ў 2 экзэмплярах;

спіс удзельнікаў аматарскага калектыву з указаннем даты іх нараджэння, асноўнага месца працы, вучобы, ролі, якую яны выконваюць у складзе аматарскага калектыву, у 2 экзэмплярах;

рэкламна-інфармацыйная прадукцыя аб творчай дзейнасці аматарскага калектыву за апошнія тры гады;

копіі водгукаў раённых, гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі аб творчай дзейнасці аматарскага калектыву за апошнія тры гады;

копіі дыпломаў раённых, гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх аглядаў, конкурсаў, фестываляў, выставак і іншых узнагарод за апошнія тры гады;

фота-, аўдыё- і (або) відэаматэрыялы аб творчай дзейнасці аматарскага калектыву на электронных носьбітах (CD, DVD), а таксама электронны варыянт дакументаў, пералічаных у абзацах пятым - дзявятым другой часткі дадзенага пункта.

Дакументы, пералічаныя ў другой частцы дадзенага пункта, завяраюцца кіраўніком арганізацыі, якая вылучае аматарскі калектыў на прысваенне наймення "народны" ("узорны"), і пячаткай гэтай арганізацыі.

6. Упраўленне культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама сумесна з абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы), дзяржаўнай установай "Мінскканцэрт" на падставе атрыманых дакументаў, пералічаных у першай і другой частках пункта 5 дадзенага Палажэння, разглядае адпаведнасць мастацкага ўзроўню і творчых паказчыкаў аматарскага калектыву патрабаванням дадзенага Палажэння.

7. Для ацэнкі мастацкага ўзроўню аматарскага калектыву ўпраўленне культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама вызначае тэрмін і арганізоўвае работу членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі з мэтай прагляду аматарскага калектыву на прадмет прысваення наймення "народны" ("узорны").

8. Склад рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі фарміруецца і зацвярджаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь з улікам прапаноў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, упраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

9. У склад рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі могуць уваходзіць прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, упраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, абласных, гарадскіх метадычных цэнтраў народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы) і дзяржаўнай установы "Мінскканцэрт", дзеячы культуры і мастацтва, спецыялісты розных відаў і жанраў мастацтва, іншыя творчыя работнікі культуры, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у развіццё аматарскай мастацкай творчасці.

10. Для прагляду членамі рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі на прадмет прысваення наймення "народны" ("узорны") аматарскія калектывы ў залежнасці ад жанравай прыналежнасці прадстаўляюць:

драматычны, музычна-драматычны тэатр, тэатр лялек - шматактавы спектакль або два аднаактавых працягласцю не менш за 60 хвілін;

тэатр оперы, балета, паэзіі і прозы, эстрады, мініяцюр, музычнай камедыі - аднаактавы спектакль альбо канцэртную праграму ў адным аддзяленні працягласцю не менш за 60 хвілін;

вакальна-харавы, харэаграфічны, музычна-інструментальны - канцэртную праграму працягласцю не менш за 60 хвілін у адным аддзяленні;

цыркавы калектыў - прадстаўленне працягласцю не менш за 40 хвілін;

фотастудыі, студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва - калектыўную выстаўку работ не менш за 16 кв. м сапраўднай плошчы прадстаўляемых работ;

кіна-, відэастудыі - поўнаметражны фільм працягласцю не менш за 52 хвіліны, або два кароткаметражныя фільмы працягласцю па 10 - 52 хвіліны, або тры мікраметражныя працягласцю менш чым па 10 хвілін, або шэсць рэкламных, сацыяльных фільмаў працягласцю менш чым па 5 хвілін, або ў розным спалучэнні агульным хранаметражом не менш за 30 хвілін.

11. Па выніках прагляду аматарскага калектыву пасля абмеркавання членамі рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі рыхтуецца заключэнне аб мастацкім узроўні і творчых паказчыках аматарскага калектыву на прадмет прысваення наймення "народны" ("узорны"), якое завяраецца подпісамі не менш за пяць членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі.

12. Заключэнне рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі змяшчае вынікі прагляду аматарскага калектыву на прадмет прысваення наймення "народны" ("узорны"), матываванае заключэнне аб мастацкім узроўні і творчых паказчыках, адпаведнасці аматарскага калектыву патрабаванням дадзенага Палажэння, прапановы па прысваенні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны").

13. Пры станоўчым заключэнні крытычныя заўвагі і прапановы членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі да дзейнасці аматарскага калектыву выказваюцца кіраўніку аматарскага калектыву ў вуснай форме.

Пры адмоўным заключэнні і неадпаведнасці аматарскага калектыву патрабаванням дадзенага Палажэння кіраўнік аматарскага калектыву азнаямляецца з заключэннем рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі, што пацвярджаецца яго подпісам.

14. На падставе станоўчага заключэння рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі аб мастацкім узроўні і творчых паказчыках аматарскага калектыву хадайніцтва аб прысваенні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны") накіроўваецца ў адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або Савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі згодна з ведамаснай прыналежнасцю аматарскага калектыву.

Да хадайніцтва дадаюцца:

заключэнне рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі ў 2 экзэмплярах;

дакументы, пералічаныя ў першай і другой частках пункта 5 дадзенага Палажэння, у 1 экзэмпляры.

15. Рашэнне аб прысваенні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны") прымаецца:

прэзідыумам Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў адносінах да аматарскіх калектываў, якія ўваходзяць у сістэму прафсаюзаў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў, акрамя творчых саюзаў;

калегіяй Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у адносінах да аматарскіх калектываў ведамаснай прыналежнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і іншых органаў кіравання, а таксама творчых саюзаў, іншых юрыдычных асоб.

16. Аматарскаму калектыву, якому прысвоена найменне "народны" ("узорны"), ва ўрачыстых абставінах у прысутнасці прадстаўніка ўпраўлення культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама і (або) абласнога, Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў уручаецца спецыяльнае пасведчанне ўзору згодна з дадаткам да дадзенага Палажэння.

Поўная назва аматарскага калектыву, якому прысвоена найменне "народны" ("узорны"), павінна пачынацца са слоў "народны" або "ўзорны".

17. У сваёй дзейнасці аматарскі калектыў з найменнем "народны" ("узорны") кіруецца дадзеным Палажэннем, Палажэннем аб непрафесійным (аматарскім) калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь, якое зацвярджаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, іншым заканадаўствам.

18. Аматарскія калектывы з найменнем "народны" ("узорны") пацвярджаюць найменне не радзей як адзін раз у тры гады.

19. Пацвярджэнне наймення "народны" ("узорны") ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пунктамі 2 - 6, 11 - 13 дадзенага Палажэння.

20. Упраўленне культуры, адукацыі аблвыканкама, упраўленне культуры, камітэт па адукацыі Мінскага гарвыканкама, абласное, Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў сумесна вызначаюць тэрміны і формы арганізацыі праглядаў аматарскіх калектываў на прадмет пацвярджэння наймення "народны" ("узорны"): агляд, конкурс, фестываль, свята, па відах мастацтва, жанрах, статусе, асобных катэгорыях арганізацый і іншае.

Упраўленне культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама арганізоўвае работу членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі з мэтай прагляду аматарскага калектыву на прадмет пацвярджэння наймення "народны" ("узорны").

21. Рашэнне аб пацвярджэнні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны") прымаецца калегіяй упраўлення культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама на падставе заключэння рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі аб мастацкім узроўні і творчых паказчыках аматарскага калектыву.

22. Выпіска з рашэння калегіі ўпраўлення культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама аб пацвярджэнні аматарскаму калектыву наймення "народны" ("узорны") накіроўваецца адпаведна ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, якія прысвоілі гэта найменне.

23. Умовы аплаты працы кіраўніка аматарскага калектыву з найменнем "народны" ("узорны") вызначаюцца заканадаўствам.

24. У аматарскім калектыве з найменнем "народны" ("узорны") можа ўводзіцца дадаткова да трох штатных адзінак, якія ўтрымліваюцца за кошт бюджэтных і (або) іншых сродкаў арганізацыі, на базе якой дзейнічае аматарскі калектыў.

25. Неабходная колькасць і склад дадатковых штатных адзінак аматарскага калектыву з найменнем "народны" ("узорны") вызначаецца заснавальнікам аматарскага калектыву з улікам прапаноў кіраўніка аматарскага калектыву.

26. Пры змене поўнай назвы аматарскага калектыву з найменнем "народны" ("узорны") у выпадку змены базы дзейнасці, назвы арганізацыі, на базе якой дзейнічае аматарскі калектыў, творчага накірунку, складу ўдзельнікаў аматарскага калектыву арганізацыя, якая з'яўляецца заснавальнікам аматарскага калектыву, не пазней за 30 дзён пасля змены поўнай назвы аматарскага калектыву паведамляе аб гэтым упраўленню культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама або абласному, Мінскаму гарадскому аб'яднанню прафсаюзаў згодна з ведамаснай прыналежнасцю аматарскага калектыву з мэтай пацвярджэння наймення "народны" ("узорны").

27. Рашэнне аб пацвярджэнні наймення "народны" ("узорны") у сувязі са зменай назвы аматарскага калектыву прымаецца калегіяй Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або прэзідыумам Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі згодна з ведамаснай прыналежнасцю аматарскага калектыву па хадайніцтве ўпраўлення культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама або абласнога, Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў.

28. Аматарскі калектыў пазбаўляецца наймення "народны" ("узорны"):

у выпадку, калі яго дзейнасць не адпавядае дадзенаму Палажэнню;

пры адмоўным заключэнні рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі;

у выпадку, калі да 31 снежня года, калі канчаецца тэрмін пацвярджэння наймення "народны" ("узорны") упраўленнем культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама не прынята рашэнне аб пацвярджэнні наймення "народны" ("узорны") у сувязі з непрадстаўленнем дакументацыі, неабходнай для пацвярджэння наймення "народны" ("узорны") згодна з пунктам 5 дадзенага Палажэння, і (або) аматарскі калектыў з найменнем "народны" ("узорны") не прадставіў творчую праграму на разгляд рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па абставінах, прызнаных упраўленнем культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама няслушнымі.

29. Рашэнне аб пазбаўленні аматарскага калектыву наймення "народны" ("узорны") прымае калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі згодна з ведамаснай прыналежнасцю аматарскага калектыву.

30. Упраўленне культуры аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама па ўзгадненні з упраўленнем адукацыі аблвыканкама, камітэтам па адукацыі Мінскага гарвыканкама або абласное, Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў у залежнасці ад ведамаснай прыналежнасці аматарскага калектыву накіроўвае хадайніцтва аб пазбаўленні аматарскага калектыву наймення "народны" ("узорны") у адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або Савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якія прымаюць адпаведнае рашэнне.

31. Фінансаванне дзейнасці аматарскага калектыву з найменнем "народны" ("узорны") ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Дадатак
да Палажэння аб народным
(узорным) непрафесійным
(аматарскім) калектыве мастацкай
творчасці ў Рэспубліцы Беларусь

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

ПАСВЕДЧАННЕ

За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці,
папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый,
высокі мастацкі ўзровень
і актыўную канцэртную, выставачную дзейнасць
прысвоена найменне
НАРОДНЫ (УЗОРНЫ) АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

_______________________________________________
_______________________________________________
_______________________________________________

Рашэнне калегіі ад ______________ N ___

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі

ПАСВЕДЧАННЕ

За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці,
папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый,
высокі мастацкі ўзровень
і актыўную канцэртную, выставачную дзейнасць
прысвоена найменне
НАРОДНЫ (УЗОРНЫ) АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

___________________________________________________
___________________________________________________
___________________________________________________

Пастанова прэзідыума Савета ад _________________ N ___